# ВЫВУЧЭННЕ КНІЖНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ МАСТАЦТВАЗНАЎЦАМІ: ДА ПЫТАННЯ ВЫБАРУ ДАСЛЕДУЕМЫХ ПОМНІКАЎ

***Г. К. Быкава***, *аспірант*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

Навуковыя работы, прысвечаныя вывучэнню мастацкага афармлення старадрукаваных выданняў, наглядна дэманструюць асноўны падыход, які выкарыстоўваецца мастацтвазнаўцамі ў працы з кніжнай спадчынай нашай краіны. Ён заключаецца ў вывучэнні кола помнікаў, аб'яднаных дзейнасцю асобы (кнігадрукара, гравёра) або друкарні. Напрыклад, у працах М. Шчакаціхіна вывучаюцца выданні Ф. Скарыны, В. Вашчанкі [6, 7], працы А. Пікулік і Н. Трыфанавай разглядаюць мастацтва старадрукаваных выданняў магілёўскай друкарні [2, 3, 4]. На даследаванні творчых дасягненняў выбітных майстроў або арыгінальных асобнікаў выданняў пабудаваны таксама працы В. Шматава [5], В. Малюшынай [1]. Кожны помнік, які аналізуюць аўтары, паўстае канкрэтным этапам у станаўленні і развіцці беларускага мастацтва старадрукаванай кнігі.

Разам з тым разнастайнасць друкаванай прадукцыі XVI–XVIII стст. дазваляе прасачыць не толькі агульную эвалюцыю прыёмаў аздаблення кнігі, але і больш тонкія працэсы фарміравання структуры і мастацкага аблічча пэўнага віду выданняў. Так, вучэбная літаратура, падпарадкаваная пэўным законам стварэння кнігі, адначасова патрабавала пошуку індывідуальнага мастацкага рашэння, абумоўленага спецыфікай яе прызначэння.

З моманту з'яўлення друкаваных вучэбных выданняў асноўным крытэрыем іх якасці выступала даступнасць выкладзенай інфармацыі. Ужо з другой паловы XVI ст. – часу выпуску такіх выданняў, як «Граматыка славянскай мовы» Вільня, 1586 г.), «Дыялектыка» (Вільня, каля 1586 г.), «Азбука» («Буквар»; Вільня, сярэдзіна 1590-х гг.) і інш. – фарміруюцца розныя спосабы падачы і арганізацыі тэкста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вага матэрыялу, арыентаваныя на эфектыўнае засваенне ведаў.

Інтэнсіўны выпуск падручнікаў працягваецца і ў XVII–XVIII стст. Пры гэтым тэматыка кніг становіцца больш шырокай. У сувязі з развіццём навукі і ўзнікненнем новых дысцыплін друкуюцца кнігі па арыфметыцы [«Arithmetica practica» (Вільня, 1635 г.)], астраноміі [«Centuria astronomica» (Вільня, 1639 г.)], матэматыцы [«Elementa arithmeticae numericae & literalis seu algebrae» (Нясвіж, 1768 г.)], геаграфіі [«Krótki zbiór polskiej historii i geografii» (Супрасль, 1767 г.)], хіміі [«Początki chemii». Т. I–II, (Вільня, 1800 г.)], біялогіі [«Flora Lituanica inchoate, seu enumertio plantarum». Collectio 1–2 (Гродна, 1781 г.), Collectio 3–5 (Вільня, 1782 г.)] і г. д. Адпавядаючы патрабаванням адукацыйнай сістэмы і новым метадам навучання, удасканальваюцца прыёмы афармлення вучэбных выданняў, развіваецца сістэма іх ілюстравання. Непасрэдны ўплыў на паліграфічнае рашэнне аказваюць пануючы мастацкі стыль і ўзровень тэхнічнага аснашчэння друкарняў.

Усе асаблівасці мастацкага афармлення вучэбнай літаратуры магчыма выявіць пры правядзенні спецыяльнага даследавання, стараннага і ўсебаковага вывучэння захаваўшыхся асобнікаў выданняў па дысцыплінах гуманітарных і дакладных навук. У даследчае кола неабходна таксама залучыць малавывучаныя выданні лацінічнага пісьма: іх параўнанне з кірылічнымі падручнікамі раскрые самабытнасць усходнеславянскай і заходнееўрапейскай традыцыі афармлення кнігі, сувязь беларускіх і замежных старадрукаў.

Такім чынам, багаты даследчы патэнцыял кніжнай спадчыны Беларусі дае магчымасць усебаковага вывучэння мастацкага афармлення старадрукаваных выданняў. Пры гэтым важную ролю адыгрывае выбар даследуемых помнікаў. Аналіз пэўнага віду выданняў, у прыватнасці, вучэбнай літаратуры, спрыяе выяўленню спецыфічных рыс яе аздаблення і больш глыбокаму асэнсаванню і асвятленню пытанняў развіцця кніжнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Малюшына, В. А.* Арнаментыка беларускіх старадрукаў (кірыліцкіх) XVI–XVIII стст.: дыс. ... канд. мастацтвазнаўства: 17.00.04 / В. А. Малюшына. – Мінск, 2002. – 108 л.

2. *Пікулік, А. М.* Максім Вашчанка і яго роля ў развіцці беларускага брацкага кірыліцкага кнігадрукавання / А. М. Пікулік // XIV Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвященные дням славянской письменности и культуры: материалы чтений «Диалог науки и религии в едином процессе познания мира и человека», Минск, 22–24 мая 2008 г. / отв. ред. и сост.: Ю. Бендин. – Минск, 2009. – С. 518–524.

3. *Пікулік, А. М.* Мастацтва магілёўскіх старадрукаў / А. М. Пікулік. – Мінск : Тэхнапрынт, 2002. – 199 с.

4. *Трифонова, Н. Я.* Гравюры «Акафистов всеседмичных» (1698) Могилевской братской типографии. Их композиционные особенности и связь с иконографией иконописных произведений восточного региона Беларуси / Н. Я. Трифонова // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Магілёў, 26–27 чэрвеня 2013 г. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў, 2013. – С. 379–382.

5. *Шматаў, В. Ф.* Мастацтва беларускіх старадрукаў, XVI–XVIII стст. / В. Ф. Шматаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 129 с.

6. *Шчакаціхін, М.* Васіль Вашчанка – магілёўскі гравёр канца XVII – пач. XVIII стагоддзя / М. Шчакаціхін // Адбітак з Навуковага зборніка Інстытуту беларускай культуры / М. Шчакаціхін. – Менск, 1925. – С. 123–135.

7. *Шчакаціхін, М.* Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны / М. Шчакаціхін ; адказны рэд. Ар. Смоліч. – Менск : Інстытут беларускай культуры, 1926. – 50 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ